УДК 94(476)"16"

***А. Л. Коц,*** *Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, кафедра гісторыі і турызму, старшы выкладчык, магістр гістарычных навук (г. Полацк, Беларусь);*

***І. С. Камінскі,*** *Крулеўшчынская сярэдняя школа, настаўнік гісторыі, магістр гістарычных навук (аг. Крулеўшчына, Докшыцкі раён, Віцебская вобласць, Беларусь)*

# Шавецкая вытворчасць горада Полацка XVII стагоддзя (па матэрыялах археалагічных даследаванняў гаспадарчага падклета на Верхнім замку ў 2016 г.)

Вывучэнне апрацоўкі скуры і пашыву з яе вырабаў разглядалася пераважна ў кантэксце археалагічных даследаванняў асобных частак г. Полацка. Частка знаходак са скуры і тэхналогіі іх вытворчасці сцісла ахарактарызаваны ў навуковых выданнях [3, 9–12]. Але адсутнічае комплексны аналіз археалагічных артэфактаў са скуры. Матэрыялы даследаванняў апісаны вельмі сцісла. Тэма апрацоўкі скуры эпізадычна раскрыта і ў межах вывучэння іншых археалагічных помнікаў Беларусі.

Выяўленне скураных парэшткаў магчыма толькі пры наяўнасці «мокрага» культурнага пласта, які добра захоўвае арганічныя рэчывы. Культурныя напластаванні з адпаведнымі ўласцівасцямі ў Полацку распаўсюджаны на Верхнім замку (даследаванні апошніх гадоў яскрава гэта пацвярджаюць) і Вялікім пасадзе, асобныя плямы зафіксаваны на Задзвінскіх пасадах.

Археалагічныя раскопкі на Верхнім замку ў 2016 г. дазволілі выявіць рэшткі абарончага вала і зафіксаваць гаспадарчую пабудову XVII ст., узведзеную пры вале, у якой выяўлены як побытавыя рэчы і прадукты харчавання, так і вялікая колькасць адыходаў скураной вытворчасці.

Верхні замак з'яўляецца адным з самых вызначальных археалагічных помнікаў Полацка. Тут месціцца самы магутны культурны пласт горада, які дасягае 5–6 м. Дзякуючы захаванню арганічных парэштак культурны пласт захоўвае рэшткі пабудоў, гаспадарчыя і побытавыя прадметы з дрэва, тканіны, скуры, косці і інш. Тут у пэўныя перыяды жыццядзейнасці людзей адбывалася вельмі інтэнсіўнае фарміраванне культурнага пласта, што абумовіла захаванасць пералічаных катэгорый знаходак. Да 2016 г. паўнавартасныя даследаванні Верхняга замка не праводзіліся з сярэдзіны 1990-х гадоў. Верхні замак Полацка ўключаны ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь як помнік X–XIII стст. пад шыфрам 213В000636.

Цэнтральную і паўднёва-ўсходнюю частку Верхняга замка займаюць карпусы былой гарадской бальніцы. У 2012–2013 гг. яна была зачынена, а ў 2018–2019 гг. былі распачаты працы па перабудове карпусоў пад кадэцкае вучылішча. У межах дадзенага праекта ажыццяўляюцца маштабныя археалагічныя даследаванні амаль на ўсёй тэрыторыі Верхняга замка [6]. Адна з пляцовак былой бальніцы (вул. Замкавая, д. 17 – былыя памяшканні санстанцыі і хуткай дапамогі) знаходзіцца ў прыватнай уласнасці. Па дамоўленасці з гаспадаром тут у 2016 г. і быў закладзены раскоп.

Дадзены раскоп не быў звязаны з даследаваннямі папярэдніх гадоў і таму атрымаў парадкавы нумар 1. Раскоп разбіты па баках свету і мае памеры 6 м × 8 м. Ён быў закладзены паміж будынкамі, на ускрайку пляцоўкі, за 55 м на ўсход ад раскопу № 4 Г. В. Штыхава 1967 г. (мал. 1, *а*). Раскоп разбіты на квадраты памерам 2 м × 2 м і мае наступную нумарацыю: па лініі поўнач – поўдзень квадраты пранумараваны ад 1 да 4, па лініі захад – усход – ад А да В. Культурны пласт здымалі па асобных пластах па 20 см. З глыбіні 1 м у раскопе зафіксаваны разнастайныя драўляныя канструкцыі: фрагменты пабудоў і насцілаў. У паўднёва-ўсходняй частцы раскопу выяўлены насып вала Верхняга замка, які не разбіраўся. У паўночна-заходняй частцы раскопу быў часткова раскапаны драўляны зруб на 3–4 вянцы. Парадкавы нумар дадзенай пабудовы пазначаны як 2А адносна іншых выяўленых канструкцый. Пры раскопках вызначана, што зруб 2А і знаходкі ў ім – гэта паўнавартасны жыллёва-гаспадарчы комплекс – падклет пабудовы (мал. 1, *б*). Ён захаваўся на чатыры вянцы ва ўсходняй сценцы, а паўночная і паўднёвая сценкі налічвалі па тры вянцы (мал. 2, *а*, *в*). Зруб пастаўлены паралельна насыпу вала. Падчас узвядзення пабудовы яна была ўрэзана ў падсыпку вала паўднёва-ўсходняй (усходняй) сцяной. Відавочна, што глініста-пясчаны слой насыпу вала станоўча ўздзейнічаў на кансервацыю драўляных сцен пабудовы. Ад насыпу вала пабудову аддзяляе траншэя шырынёй да 0,2–0,4 м, якая ўтварылася падчас будаўніцтва зруба. Яна запоўнена пераадкладзеным культурным слоем: пераважна гэта светлы пясок (супесак) з украпінамі чорнага і светла-шэрага культурнага слоя. Знаходкі з траншэі прадстаўлены нешматлікімі фрагментамі керамікі, кавалкамі бярвенняў, дошак і драўнянай парахнёй.




Мал. 1. Вызначэнне месца правядзення раскопак (*а*) і планаграфія на ўзроўні умоўнага пласта 18 з рэшткамі драўлянай пабудовы XVII ст. (*б*). Верхні замак. г. Полацк. 2016 г.

Падклет раскапаны часткова: зафіксавана толькі тры сцяны. Мяркуем, што ўскрыта каля 2/3 часткі ад агульнай плошчы будынка. Астатняя частка засталася нераскапанай у паўночнай сценцы раскопу. Стан захаванасці драўлянай канструкцыі выдатны. Вуглы рублены без астатку ў «ластаўкін хвост» (гл. мал. 2, *в*). Бярвенне зачэсана ў выглядзе брусоў, вышыня якіх дасягае 30–35 см пры шырыні каля 20 см. Верх бервяна закруглены, а ніз мае увагнутую форму. Пазы паміж бярвеннем не пракананачаны. Ніжняе бервяно ўсходняй сцяны на 0,2 м заглыблена ніжэй узроўню падлогі. Вышыня зруба, які захаваўся, – да 1,2 м. Яго шырыня складае 4,25 м па знешнім баку, даўжыня – не менш 2,9 м па знешнім баку (паўночная сценка), унутраная прастора мае шырыню 3,9 м (па трасе ўсходняй сценкі). У Полацку ў XVII–XVIII стст. былі шырока распаўсюджаны дамы́ на падклетах. Яны выконвалі функцыі склепа і з'яўляліся асновай жылога дома. Падклет вылучаў пабудову ўладальніка з ліку радавых і паказваў на сацыяльнае становішча гаспадара [4, с. 205].

Падлогай падклета з'яўляўся светла-шэры пясок, які быў слоем падсыпкі вала. Культурны пласт у запаўненні пабудовы – пераважна чорны гумусавы з украпінамі вугалю, зафіксавана шмат шчапы і трэсак, асабліва ў ніжніх пластах. У запаўненні зруба выяўлены завал драўляных канструкцый (дошкі і бярвенне) ад верхняй часткі пабудовы (мал. 1, *в*; 2, *б*). У адзначаным завале выяўлена цікавая знаходка прысценнай лавы, якая па сваёй канструкцыі магла быць замацавана ў пазах паміж бярвеннямі (мал. 3: *7*). Шэраг дошак і бярвенняў з завала маюць пэўныя запілы, зарубкі і інш. Археалагічныя зна-




Мал. 2. Зачысткі на ўзроўні ўмоўнага пласта 18 і гаспадарчага падклета XVII ст. (*а*), завал драўляных канструкцый і элементаў унутры падклета (*б*), прамалёўка падклета пабудовы на 3–4 вянцы (*в*). Верхні замак. г. Полацк. 2016 г. Малюнак В. А. Коц (*в*)




Мал. 3. Артэфакты (фрагменты): *1* – латка; *2* – гаршкі-спарышы; *3* – друшляк; *4* – біклага; *5* – збан з зялёнай палівай; *6* – прыклады венцаў гаршкоў; *7* – лава. Матэрыял: *1–6* – кераміка; *7* – дрэва. Першая трэць XVII ст. Гаспадарчы падклет. Верхні замак. г. Полацк. 2016 г.



Мал. 4. Вырабы з лямцу: *1–5* – сцілкі (фрагменты). Першая трэць XVII ст. Гаспадарчы падклет. Верхні замак. г. Полацк. 2016 г.

ходкі сведчаць, што падклет мог выкарыстоўвацца для гаспадарчых мэт.

Культурны слой пабудовы насычаны фрагментамі керамічнага посуду. Калі ў верхніх пластах (умоўныя пласты 8–10) канцэнтрацыя керамікі была вельмі вялікая (сярод яе прысутнічае шмат паліванага посуду і маюцца развалы керамічных гаршкоў), то ў ніжніх слаях пераважае непаліваны посуд і канцэнтрацыя яго зніжаецца (мал. 3: *6*). Найбольш вызначальныя масавыя знаходкі з пабудовы – гэта развалы керамічных начынняў і кафлі: развал гаршковай кафлі, вялікія фрагменты гаршка, рукамыйніка[1], развалы керамічных збаноў (мал. 3: *5*), развал вялікай керамічнай місы (мал. 3: *1*), фрагменты керамічнай біклагі (мал. 3: *4*). Асобна варта адзначыць знаходкі фрагментаў керамічных спарышаў (мал. 3: *2*) (пяць знаходак) і глінянага друшляка (мал. 3: *3*). Прысутнічаюць тут таксама фрагменты гаршковай і міскавай кафлі. На дне пабудовы 2А выяўлена каменнае ядро. Верагодней за ўсё, яно патрапіла ў будынак у межах другаснага выкарыстання. На гэта указваюць рознечасовасць датавання пабудовы і перыяд датавання такіх ядраў. Па ўсёй плошчы пабудовы трапляецца шкарлупіна лясных арэхаў і знойдзены дзве палавінкі шкарлупіны грэцкіх арэхаў. У межах пабудовы (у тым ліку і ў запаўненні) сабрана восем калекцый зерня.

На земляной падлозе і ў ніжніх пластах пабудовы зафіксавана вялікая колькасць скураных адыходаў ад пашыву абутку, фрагменты абутку, разнастайныя шнуркі, кавалкі скуры, дэталі іншых прадметаў і г. д. На дне пабудовы скура ляжала ў спрасаваным слое магутнасцю 10–15 см. На поўнач ад аблогі скуры пры ўсходняй сцяне пабудовы 2А выяўлена значная колькасць зерня, якога сабрана каля 10 л (калекцыя 8). Паверх слоя зерня выяўлены кавалкі лямца. Таксама асобныя кавалкі лямца і лямцавых сцілак зафіксаваны разам са скурай (мал. 4). Знаходкі са скуры прадстаўлены пераважна фрагментамі абутку, нарыхтоўкамі і абрэзкамі скураной вытворчасці. Сярод фрагментаў абутку сустракаюцца падэшвы і іншыя дэталі ботаў, чаравікаў, поршняў, скураныя раменьчыкі, абрэзкі, халявы ботаў і інш. Выяўлены таксама асобныя вырабы. У вопісе індывідуальных знаходак артэфакты са скуры займаюць больш 180 пазіцый. У вялікай колькасці сабраны дробныя абрэзкі скуры.

Найбольш адметнай знаходкай з'яўляецца кавалак скуранога рэменя (мал. 5: *1*), што захаваўся ў двух фрагментах. Знаходка выраблена з тонкай скуры, якая складзена папалам і прашыта. Адзін канец рэменя акуратна завершаны і прашыты, другі – адарваны. На рэмені маецца 11 вялікіх адтулін дыяметрам да 1 см. Падобная знаходка нагадвае фрагмент конскай вупражы.

Цікавымі з'яўляюцца асобныя прадметы гаспадарчага (або рамеснага) ужытку: скураны раменчык з завязанымі канцамі, асобныя скураныя раменчыкі (на некаторых канцах завязаны вузельчыкі), прамакутныя кавалкі скуры з прораззю.

Адна знаходка са скуры мае ромбападобную форму (мал. 5: *2*). Яна была складзена ў чатыры столкі. Унутры знойдзена насенне. Прадмет зроб-

[1] З 3D-мадэллю рукамыйніка можна азнаёміцца па спасылцы https://sketchfab.com/3d-models/hipoly-af84347e079b4a4f8963d5cbedac0ac8.



Мал. 5. Вырабы са скуры: *1* – рэмень (фрагмент); *2* – дэталь сумкі. Першая трэць XVII ст. Гаспадарчы падклет. Верхні замак. г. Полацк. 2016 г.

лены з тонкай скуры. Відавочна, што гэта дэталь спецыяльнай сумкі.

Асноўная калекцыя знаходак скуранога абутку ўяўляе з сябе адыходы ад шавецкай вытворчасці (абрэзкі ад раскрою ліста скуры, дэталі абутку са слядамі адразання для другаснага выкарыстання, дэталі са слядамі рамонту і пашыву абутку)[1]. На прафесійны характар апрацоўкі ўказваюць стандартызаваныя формы раскрою для вырабаў і раскрой гатовых вырабаў. Гэта праяўляецца ў зрэзаных пад вуглом падэшвах, раскроі халяваў, абрэзе швоў дэталяў верху абутку, раўнамерным выкананні швоў.

Стан захаванасці набораў пятачных вузлоў, асобных дэталяў задніка і падэшваў дазваляе часткова рэканструяваць склад набору задніка і характар злучэння дэталяў верху і нізу абутку.

Падэшвы ў асноўным фрагментаваныя і маюць сляды расслаення (зафіксавана 20 знаходак). Некаторыя экзэмпляры (не менш шасці артэфактаў – № 420, 490, 491, 581, 582, 648) маюць лініі адрэзаў (мал. 6: *1*, *2*). Гэта сведчыць аб тым, што пасля выкарыстання абутку ад яго падэшваў адразалі кавалкі скуры для другаснага выкарыстання. Зафіксавана адна падэшва, якая захавалася на поўныя даўжыню і шырыню (мал. 6: *4*).

Мяркуючы па слядах швоў, верх і ніз абутку злучалі сандальным швом, вываратным метадам швоў «у падтай», у тым ліку з надрэзам унутранай паверхні па контуры шва, камбінаваным спосабам і рантавым метадам. На знешняй паверхні ніжніх слаёў падэшваў, злучаных сандальным швом, зафіксаваны надрэз для захоўвання шва (мал. 6: *3*; 7: *4*). Таўшчыня скуры рэдка перавышае 0,25 см. Зафіксаваны падэшвы як прафіляваныя, так і без звужэння ў пярэйме, са скругленым і звужаным наском.

Адзін з тыпаў прадстаўлены абуткам без абцаса і прашыты асноўным сандальным швом. Трохслойная падэшва злучана з заднікам і верхам абутку раўнамерна выкананым сандальным швом. На ніжнім пятачным слаі падэшвы зроблены надрэз для захавання шва. Набор задніка складваецца з кармана, скураной пракладкі і задзінкі (мал. 6: *3*; 7: *2*). Злучаны з перадам абутку вываратным швом. Фрагментаванасць знаходак не дазваляе казаць аб наяўнасці ў наборы задніка берасцяных ці скураных дэталяў задніка, якія не змацоўваліся з падэшвай агульным швом.

Варыянтам умацавання пятачнай часткі абутку без абцаса ад зносу з'яўлялася падбіццё жалезнымі цвікамі з круглымі шляпкамі дыяметрам 0,5–0,6 см. Гэта характэрна для абутку цвёрдай канструкцыі, якая з'явілася ў XVI ст. і фіксуецца на абутку пазнейшага часу адначасова з падкоўкамі [1, с. 359; 4, с. 117]. Зафіксаваны варыянт адначасовага падбіцця цвікамі і надрэз для захоўвання сандальнага шва на знешняй паверхні падэшвы.

Абутак, верх і ніз якога злучаліся патайным швом, прадстаўлены двума варыянтамі: з надрэзам і без надрэзу па перыметры шва. Існаваў камбінаваны спосаб злучэння падэшвы і верху абутку, дзе ад насавой да галенастопнай часткі дэталі сшываліся патайным швом, а пятачная частка – сандальным. Падэшвы камбінаванага спосабу злучэння характарызуецца звужэннем у пярэйме. Падэшвы з патайным швом сярод віцебскага матэрыялу датаваны XVI–XVIII стст. [2, с. 133, мал. 40: *23*].

Дэталі нізу абутку прадстаўлены шэрагам знаходак. Яны вызначаны як прашытыя (4 экз.), ёсць і змацаваныя цвікамі ці драўлянымі шпянямі (па 1 экз.). Мяркуючы па слядах сшывання, дэталі нізу абутку прашываліся ў агульны шоў з заднікам і ўяўлялі з сябе падпятачныя пракладкі. Пераважаў

[1] Апісанне знаходак дэталяў скуранога абутку створана з улікам розніцы паміж сучаснай тэрміналогіяй абутковай вытворчасці і тэрміналогіяй, якая замацавалася ў гістарыяграфіі. Апошняй аддаецца перавага. Пры неабходнасці канкрэтызацыі назвы дэталяў у дужках прыводзяцца адпаведнікі з сучаснай абутковай тэрміналогіі. Усе асобныя элементы набору задніка, якія з'яўляліся ўнутранай часткай пяткі абутку, названы *карманам задніка*. Прамежкавыя дэталі ў апісанні пятачных вузлоў паміж *карманам* і *заднікам* (*задзінкай*) адзначаны як *пракладкі* (гэта ўласна *заднік* у сучаснай абутковай тэрміналогіі). Асобныя дэталі нізу абутку, якія служылі для ўмацавання падэшвы ад зносу (падпятачная пракладка, флік ад знешняга абцаса, прамежкавыя дэталі нізу абутку), з прычыны фрагментарнасці і знаходжання іх не ў складзе пятачнага вузла або наборнага абцаса, немагчыма канкрэтызаваць, таму яны ўказваюцца як *дэталь нізу абутку.*



Мал. 6. Элементы скуранога абутку:
*1* – падэшва са слядамі адрэзу (фрагмент);
*2* – жалезная абутковая падкоўка (прамалёўка);
*3*, *4* – дэталі нізу абутку. Першая трэць XVII ст.
Гаспадарчы падклет. Верхні замак. г. Полацк. 2016 г.



Мал. 7. Дэталі скуранога абутку:
*1*, *2* – заднікі; *3*, *4* – паднарад; *5* – галоўка абутку
з загнутым уверх наском; *6* – адтуліны ў скуры –
сляды прашывання. Канец XVI – XVII ст.
Гаспадарчы падклет. Верхні замак. г. Полацк. 2016 г.

варыянт прашыцця. Асобна зафіксаваны тры заднікі ад абутку (мал. 7: *1*, *2*). Частку знаходак (не менш 12 экз.) з пэўнай доляй верагоднасці можна вызначыць як падпятачныя пракладкі. Але на ўсіх дэталях нізу абутку не зафіксавана дадатковага ўмацавання падкоўкамі. Калекцыя жалезных падковак з раскопу 1 прадстаўлена 33 артэфактамі, але большая колькасць з іх паходзіць з умоўных пластоў 1–7 і не суадносіцца з апісаным падклетам, на дне якога была выяўлена толькі адна жалезная абутковая падкоўка без слядоў выкарыстання (мал. 6: *2*).

Дэталі рантавага абутку прадстаўлены фрагментамі падэшваў, задзінкі і рантаў. Рантавы абутак па матэрыялах Віцебска (паводле Т. С. Бубенька) датаваны другой паловай XVII ст. [2, с. 131]. Аналогіі канструкцыі знойдзеных рантаў на Верхнім замку ў Полацку ёсць у матэрыялах Вільні і Смаленска першай паловы XVII ст. [8, с. 391–392]. Іх характэрнай рысай з'яўляецца наяўнасць трох радоў адтулін, дзе адзін рад служыць для злучэння канца ранта з унутранай падэшвай і заднікам, а два іншыя рады – след ад злучэння ранта са знешняй падэшвай.

Асобныя элементы набору задніка прадстаўлены знаходкамі знешніх частак – задзінак, і ўнутраных (карманы задніка). Апошнія маюць пераважна прамавугольную форму і злучаны з задзінкай пераметачным швом. Неабходна адзначыць, што ў наборы задніка абутку без цвёрдых прамежкавых пракладак унутраная дэталь магла ўяўляць з сябе мяккі пласт задніка (пракладку), але не карман для захоўвання цвёрдага пласта. Большасць задзінак абутку маюць прамавугольную форму (4 экз.), скошаныя (1 экз.) і прамыя (3 экз.) бакавіны. Кілявідны верхні край у дзвюх знаходак. Злучэнне з перадам і халявамі абутку раўнамерна выканана тачным і вываратным швамі.

Калі судзіць па форме насавой часткі падэшваў, галовак і паднарадаў (мал. 7: *3*, *5*) пераду абутку, яна прадстаўлена загнутым уверх наском і закругленым наском. Асноўныя тыпы галовак і паднарадаў маюць закругленую насавую частку. Паднарады выключна аднаскладовыя і закрываюць насавую частку галовак. Яны датаваны XVI–XVIII стст. Галоўка (гл. мал. 7: *5*) належыць абутку з загнутым уверх наском. У выемку на насавой частцы галоўкі ўшывалі падэшву завостранай формы. З'яўленне ботаў з загнутым уверх наском падэшвы, якія ўшывалі ў выраз на галоўцы, датавата мяжой XV і XVI ст. [5, с. 217]. Найбольшае распаўсюджанне адзначанага тыпу па матэрыяле з Расіі фіксуецца да

сярэдзіны XVI ст., пры гэтым дадзены тып існаваў і пазней – да пачатку XVII ст. [5, с. 232]. Галоўкі з выемкай для падэшвы па віцебскіх матэрыялах бытавалі да канца XVI ст., а асобны тып з фігурным абрэзам верхняга краю быў уласцівы для ўсяго XVII ст. [2, с. 133, 136].

Шмат знаходак прадстаўляюць дэталі верхняй часткі абутку (не менш сямі знаходак). Інтарэс выклікаюць чатыры знаходкі абрэзкаў ад раскрою халяў ботаў з круглымі адтулінамі ў верхняй частцы. Халявы ботаў і абрэзкі ад іх раскрою з ідэнтычнымі адтулінамі вядомы па матэрыялах Ноўгарада, Пскова, Івангорада і іншых гарадоў XVI – пачатку XVII ст. [5, с. 517]. Яны маглі выконваць як дэкаратыўную, так і прагматычную функцыю. Існуюць выпадкі іх знаходжання з узмацняльнымі пракладкамі па акружнасці. Гэта абумовіла меркаванні аб выкарыстанні адтулін для нацягвання халяваў пры абуванні ботаў [5, с. 224; 7, с. 201]. Аднак не выключана магчымасць абшыўкі краю адтулін каляровай тканінай або скурай [5, с. 224].

Рэдкія знаходкі можна вызначыць як нарыхтоўкі дэталяў абутку (на якіх адсутнічаюць швы ці нават сляды швоў), што з'яўляецца прамым пацвярджэннем вырабу абутку. У асобных выпадках зафіксаваны нават ніткі. На адным бясформенным кавалку скуры (таўшчынёй не больш 1 мм) захаваліся шматлікія дзірачкі ад тонкай іголкі (мал. 7: *6*).

Дзякуючы ўласцівасцям зямлі захоўваць арганічныя рэчывы атрымалася выявіць шэраг знаходак з воўны. Знойдзены фрагменты лямцавых сцілак (гл. мал. 4) сярод скураных абрэзкаў у межах пабудовы 2А на ўзроўні ўмоўнага пласта 16. Адна сцілка захавалася станоўча на 50–60 % (гл. мал. 4: *2*). Яе шырыня каля пяткі – 5,5 см, пасярэдзіне – 6,0, даўжыня, якая захавалася, – 16,0 см.

Астатнія знаходкі з воўны прадстаўлены толькі кавалкамі збітага лямцу рознага памеру – (20,0 × 10,0, 9,5 × 5,0, 10,0× 5,0, 3,5 × 1,3) см. Іх можна ахарактарызаваць як нарыхтоўкі. Таўшчыня фрагментаў, што захаваліся, – каля 0,5 см. Усе знаходкі з лямцу маюць карычневы колер.

## Высновы

Такім чынам, у раскопе 1 на Верхнім замку старажытнага Полацка ў 2016 г. была выяўлена драўляная пабудова зрубнай канструкцыі, якая з'яўлялася гаспадарчым падклетам і выкарыстоўвалася для захавання разнастайных рэчаў. Канструкцыя часткова была ўрэзана ў насып вала, а напольным бокам выходзіла на пляцоўку замка. У пабудове знойдзены сляды шавецкай вытворчасці. Відавочна, што дадзены гаспадарчы падклет уваходзіў у межы сядзібы шаўца і з'яўляўся складам для захавання вытворчых адыходаў майстра. Тут сабрана вялікая калецыя кавалкаў, абрэзкаў, дэталяў, асобных частак, фрагментаў вырабаў са скуры. Асноўная маса знаходак з'яўляецца часткамі абутку. Таксама зафіксаваны адыходы вытворчасці, дэталі і фрагменты абутку са слядамі другаснага выкарыстання. Дакладных слядоў рамеснай дзейнасці па пашыве абутку ў межах раскопу не выяўлена.

На аснове выяўленай калекцыі можна вызначыць пэўныя прыкметы пашыву абутку, характэрныя для Полацка ў канцы XVI – XVII ст.

1. *Канструкцыя абутку.* Нягледзячы на наяўнасць пераважна фрагментаваных знаходак, можна казаць аб іх прыналежнасці да дэталяў абутку цвёрдай канструкцыі. Аб гэтым сведчаць мнагаслойнасць падэшваў, пятачныя вузлы, якія прадстаўлены наборам задніка (задзінка, скураныя пракладкі, карман задніка), падбіццё пятачнай часткі падэшваў цвікамі, выкарыстанне паднарадаў.

2. *Спосаб злучэння верху і нізу абутку.* Полацкі абутак канца XVI – XVII ст. характарызаваўся разнастайнасцю спосабаў злучэння верху і нізу. Падэшвы і верх абутку маглі злучацца сандальным швом, патайным швом, рантавым метадам. Існаваў камбінаваны спосаб, дзе пятачная частка мела сандальны шоў, а частка ад пярэймы да наска – патайны. Характэрнай рысай гэтага абутку з'яўляецца перавага ў злучэнні пятачнай часткі падэшвы і наборам задніка сандальным швом.

3. *Формы крою дэталяў абутку.* Калекцыя прадстаўлена такімі відамі дэталяў, як падэшвы, галоўкі, задзінкі, карманы задніка, паднарады, фрагменты ад раскрою халяваў ботаў.

У Полацку выкарыстоўваліся падэшвы як прафіляваныя, так і без звужэння ў пярэйме, з закругленым наском. Пэўнай прыкметай полацкага абутку канца XVI – XVII ст. былі падэшвы з завостраным наском, які падшываўся да выразу ў галоўцы пераду абутку.

Перад абутку (галоўкі і паднарады) пераважна меў закругленую форму. Паднарады былі аднаскладовыя і не ахаплівалі ўсю плошчу галоўкі. Яны закрывалі насавую частку галоўкі да месца згібу ступні пры хадзьбе.

Заднікі (задзінка) і карманы заднікаў мелі разнастайныя формы: падпрамавугольныя, трапецападобныя, кілявідныя.

Характэрнай рысай для крою ботаў канца XVI – XVII ст. у Полацку з'яўляюцца круглыя адтуліны ў верхняй частцы халяваў.

4. *Варыянты захавання ніжняй часткі падэшвы ад зносу.* Падэшвы характарызуюцца мнагаслойнасцю. Пятачная частка дадаткова ўмацоўвалася падпятачнымі пракладкамі. Выкарыстоўваўся такі спосаб, як падрэз ніжняй часткі падэшвы для захавання шва ад зносу. Пятачная частка падэшвы магла так-

сама падбівацца цвікамі. Зафіксаваны варыянт аднасовага падбіцця цвікамі і надрэз для захоўвання сандальнага шва на знешняй паверхні падэшвы.

Акрамя абутку артэфакты са скуры іншых катэгорый прадстаўлены адзіночнымі прадметамі – рэменем і дэталлю сумкі. Увесь выяўлены комплекс падклета пабудовы паводле рэчавага матэрыялу (знаходкі са скуры, кераміка, металічныя вырабы) можна датаваць першай трэццю XVII ст.

## Літаратура

1. Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск : Беларуская навука, 1997–2001. – Т. 4 : Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 597 с.

2. Бубенько, Т. С. Кожаная обувь средневекового Витебска XII–XVIII вв. (по материалам исследований Нижнего замка) / Т. С. Бубенько // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Новыя матэрыялы і даследаванні. 1993. – С. 127–137.

3. Дук, Д. Кожевенно-сапожное ремесло Полоцка XVI–XVIII вв. по итогам археологического надзора на территории Великого посада в 2000–2002 гг. / Д. Дук, А. Соловьев // Гістарычна-археалагічны зборнік / рэдкал. М. Касцюк [і інш.]. – Мінск, 2004. – № 19. – С. 241–250.

4. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 268 с.

5. Курбатов, А. В. Кожевенное ремесло в средневековой России : дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.06 / А. В. Курбатов. – СПб., 2012. – 622 с.

6. Начальный этап новых исследований Верхнего замка Полоцка (2018–2020 гг.) / О. Н. Левко [и др.] // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. арт. V Міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А. І. Корсак (адк. рэд.), В. У. Чараўко, У. Я. Аўсейчыка. – Наваполацк, 2021. – С. 48–60.

7. Осипов, Д. О. Кожевенно-сапожное ремесло Великого Новгорода X–XVII вв. (комплексное исследование) : дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.06 / Д. О. Осипов. – М., 2012. – 395 л.

8. Осипов, Д. О. Коллекция кожаной обуви из раскопок в Смоленске / Д. О. Осипов, В. Е. Соболь // Materialy Zachodniopomorskie, Nowa Seria. Archeologia. – Szczecin, 2013. – T. IX. – S. 375–405.

9. Тарасов, С. В. Технология и инструменты кожевенно-сапожного ремесла Полоцка и Минска (XI–XVIII вв.) / С. В. Тарасов // Памятники науки и техники 1987–1988 гг. – Минск, 1989. – С. 164–175.

10. Штыхаў, Г. В. Гарбарнае рамяство старажытнага Полацка / Г. В. Штыхаў // Весці Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1961. – № 3. – С. 63–73.

11. Штыхаў, Г. В. Шавецкае рамяство старажытнага Полацка / Г. В. Штыхаў // Весці Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1962. – № 3. – С. 81–90.

12. Штыхов, Г. В. Опыт исследования древнеполоцкой кожи / Г. В. Штыхов // Советская археология. – 1963. – № 4. – С. 240–246.

## Резюме

*А. Л. Коц, И. С. Каминский*

**Сапожное производство города Полоцка XVII века**
**(по материалам археологических исследований хозяйственного подклета на Верхнем замке в 2016 г.)**

В 2016 г. проводились археологические раскопки на Верхнем замке древнего Полоцка. В ходе исследований были выявлены оборонительный вал и пристроенная к нему деревянная постройка, которая сохранилась на 3–4 венца. Она была предназначена для хранения различных вещей хозяйственного назначения. В нижних слоях заполнения конструкции выявлено большое количество кожаных обрезков, фрагментов кожаной обуви (подошвы, головки, задинки, карманы задника, поднаряды, фрагменты от раскроя голенища сапог), заготовки кожевенного производства, отдельные детали изделий. Анализ данного материала позволил определить приметы пошива обуви, характерные для г. Полоцка в конце XVI – первой половине XVII в. Выявленный комплекс хозяйственного подклета на основе вещевого материала (находки кожи, керамика, металлические изделия) датирован первой третью XVII в.

## Summary

*A. Kots, I. Kaminsky*

**Shoemaking in Polotsk in the 17th century**
**(materials from archaeological research of the utility basement at the Upper Castle in 2016)**

Archaeological excavations were carried out at the Upper Castle of ancient Polotsk in 2016. The researchers have revealed a defensive rampart and a wooden basement in the excavation. The wooden building was preserved for 3–4 log crowns. It was intended for storage of various household items. In the lower layers of the ground in the building there were many of leather scraps, fragments of leather shoes (soles, back pockets of shoes, fragments from cutting the leg of boots and others), blanks and separate parts of products. The researchers determined the signs of tailoring shoes in Polotsk at the end of the 16th – first half of the 17th centuries. The finds (leather items, ceramics, metal artifacts) from the wooden building date back to the first third of the 17th century.

*Паступіў 19.04.2022*